

# Мазыршчына: людзі, падзеі, час

**Матэрыялы**
**II Рэспубліканскай**
**навукова-практычнай канферэнцыі**
**Мазыр, 25–26 мая 2012 года**

**Мазыр**
**2012**

## СЕКЦЫЯ 1
## ДУХОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ ПРАВАСЛАЎЯ І СУЧАСНАСЦЬ

### ХРЫСЦІЯНСКІЯ АСВЕТНІКІ БЕЛАРУСІ АБ РОЛІ МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ЖЫЦЦІ ГРАМАДСТВА

В. С. Болбас
УА МДПУ імя І. П. Шамякіна (Мазыр)

Выхаванне ва ўсходніх славян, як і ў іншых народаў свету, узнікла на самых ранніх этапах развіцця грамадства ў сувязі з неабходнасцю стымуляваць актыўнасць, карэкціраваць, дапаўняць стыхійную сацыялізацыю дзяцей, накіроўваць іх развіццё ў неабходным для людской супольнасці напрамку. З цягам часу працэс гадавання дзяцей набываў усё больш мэтазгодны, кіруемы характар. Выхаванне было прызвана забяспечыць найбольш поўнае засваенне падрастаючымі пакаленнямі сацыяльнага вопыту, набытага папярэднікамі.

Прынцыпова змянілася роля маральнага выхавання з распаўсюджваннем хрысціянства. Па-першае, у хрысціянстве ўвогуле маральна-духоўнае ўдасканаленне асобы выступае ў якасці сэнсу жыцця. Па-другое, на беларускіх землях практычна ва ўсе часы маральна-этычныя праблемы вылучаліся ў якасці прыярытэтных. Па-трэцяе, хрысціянская этыка пастуліравала, што чалавек ад нараджэння надзелены магчымасцю не толькі ўдасканальваць, а і карэнным чынам мяняць сваю маральна-духоўную сутнасць. Таму маральнае выхаванне лічылася найважнейшым фактарам, здольным пераўтваральна ўздзейнічаць на асобу і грамадства. Аналіз арыгінальнай і перакладной літаратуры, летапісных збораў і шматлікіх зборнікаў выслоўяў і афарызмаў старажытнарускага перыяду дазваляе зрабіць такі вывад, бо “менавіта ў маральнай сферы з найбольшай дзейнасцю праявілася значэнне хрысціянства як адной з найбольш уплывовых сусветных рэлігій” [1, 37]. Лічылася, што ў чалавека можа адначасова сумяшчацца і добрае, і дрэннае, і патрэбны істотныя намаганні, каб станоўчае атрымала перамогу.

Падкрэсліваючы выключную ролю маральна-духоўнага выхавання ў радыкальным пераўтварэнні грамадства, І. І. Бяцкой так апісваў распаўсюджванне на айчынных землях хрысціянства, якому неабходна было “произвести сперва способомъ воспитанія, такъ сказать, новую породу, или новыхъ отцовъ и матерей, которые бъ детямъ своимъ те-же прямыя и основательныя воспитанія правила въ сердце вселить могли, какія получили они сами, и отъ нихъ дети предали-бъ паки своимъ детямъ, и такъ следуя изъ родовъ въ роды въ будущіе веки” [2, 106]. Імкненне да высокай маральнасці трактуецца хрысціянскай этыкай як адзіна магчымы шлях развіцця, а духоўнасць аб’яўляецца пачаткам пачаткаў і змястоўным

напаўненнем жыцця. Не сацыяльнае становішча вызначала маральнасць асобы, а, наадварот, маральны статус чалавека дапамагаў вызначыць яго лакальнае месца ў грамадстве і ўсталяваць адпаведныя ўзаемаадносіны. Яркім прыкладам падобнай ацэнкі ролі маральнага выхавання ў жыцці тагачаснага грамадства стала жыццё і дзейнасць славутай айчыннай асветніцы XII ст. Еўфрасінні Полацкай, якая шляхам самаўдасканалення з высокай духоўнай страсцю і апантанасцю падзвіжніка ўзнялася да нябачаных дагэтуль вяршынь і з дапамогай маральна-выхаваўчага ўздзеяння дапамагла ўзвысіцца сваім вучаніцам, каб жыць у "чистоте душевной". Асветніца жадала бачыць вынікам маральна-духоўнага выхавання мір і згоду сярод людзей: "…Не бо хотяше видети кого которающася: ни князя со князем, ни болярина з болярином, ни от простых кого со своим другом, но всех хотяше имети, яко едину душу" [3, 36].

Шмат намаганняў для вырашэння задач маральна-духоўнага аздараўлення грамадства зрабіў славуты айчынны асветнік-мысліцель XII ст. Клімент Смаляціч. Летапісец адзначыў, што ў гэтым напрамку яму не было роўных: "И бысть книжник и философ так, якоже в Русской земли не бяшеть" [4, 102]. К. Смаляціч засяроджваў увагу на пастаянным развіцці духоўных асноў: "И если мы, будучи творением Божиим, действуем сотворенною Богом тварью, как хотим, то что для нас, возлюбленные, может быть лучше, как помышлять особенно о Боге" [5, 190].

Верыў уператваральную сілу выхаваўчага ўздзеяння айчынны Златавуст – Кірыла Тураўскі. Ім досыць выразна сфармулявана ацэнка вынікаў маральна-духоўнага выхавання: "Добро убо, братье, и зъло полезно, еже разумъвати нам божественных писаний учение: се и душу цъломудрену створяеть, и к смирению прилагаеть ум, и сердце на реть добродътели извоостряеть, и всего благодарьствена человъка створяеть, и на небеса ко владычним объщанием мысль приводить, и к духовным трудом тъло укръпляеть, и приобидъние сего настоящаго жития, и славы и богатьства творить, и всея житискыя свъта сего печали отводить" [6, 290]. Кірыла Тураўскі падкрэслівае, што, стварыўшы чалавека, Бог даў яму свабоду волі. Дзякуючы гэтаму, кожны індывід можа сам выбраць свой шлях у жыцці, сам па сваім жаданні здзяйсняць любыя ўчынкі, сам фарміраваць уласныя паводзіны, але ж і несці асабістую адказнасць за іх наступствы.

Такім чынам, Кірыла Тураўскі ўзвышае агульначалавечую праблематыку, злучае ў адзінае цэлае катэгорыі дасканалага, разумнага, вечнага, прыгожага, цнатлівага і сцвярджае адвечнае значэнне маральна-духоўных каштоўнасцей. "Познающий разум" асветнік уяўляе як сапраўды свабодны розум, але хоча, каб ён быў скіраваны не на дылему далучэння





да дабра ці зла, а на свабодны выбар пэўных шляхоў, якія вядуць толькі да дабра.

Перыяд X–XIII стст. у развіцці этыка-педагагічнай думкі адзначаны тым, што роля маральнага выхавання ў многім была абумоўлена праблемай "самаўладдзя душы" або свабоды волі чалавека. Трэба адзначыць, што гэтая праблема з'яўляецца трансцэндэнтнай у развіцці айчыннай этыка-педагагічнай думкі X – к. XVIII стст.

У адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі хрысціянскай этыкі айчынныя грамадскія, рэлігійныя і педагагічныя дзеячы растлумачвалі, што шляхам удасканалення сваёй прыроды чалавек можа з годнасцю прайсці зямны шлях і дасягнуць Божай ласкі. А ідэолагі ерэтычнага руху антытрынітарыяў сцвярджалі, што нязменныя намаганні чалавека па ўдасканаленню сваёй існасці дазволяць яму стаць сынам Божым. "І мы можам зрабіцца сынамі Божымі, – даказваў Арый, – Бог выбраў Хрыста з усіх іншых сыноў таму, што ведаў аб ім, што Ён не адвернецца... Не таму выбраў Яго, што Ён па існасці мае нешта асаблівае..., але таму, што, нягледзячы на нязменлівасць сваёй прыроды, Ён праз сваю маральную дзейнасць не скланіўся да худога (дрэннага)" [4, 41].

Яшчэ больш выразна і рашуча акцэнтавалася ўвага на вядучую ролю маральнага выхавання ў фарміраванні дасканалай асобы ў наступныя перыяды развіцця айчыннай этыка-педагагічнай думкі.

Робячы акцэнт на новазапаветныя пастулаты, айчынны першадрукар Ф. Скарына зазначае, што "царство небесное еже ест земля живых" [7, 41]. У першую чаргу, ва ўяўленні асветніка, нябеснае царства – гэта стан чалавечай душы, і дабіцца яго чалавек можа праведным, высокамаральным жыццём. Рабіў спробу тэарэтычных абагульненняў у асэнсаванні ролі маральнага выхавання Сымон Будны. Ён рашуча адвяргаў уяўленні аб прыроджанай прадвызначанасці людскога лёсу і катэгарычна заяўляў, што кожны чалавек ёсць прадукт выхавання. "Не трэба здзіўляцца, – пісаў ён аб маральных якасцях людзей, – гэта ў іх не ад прыроды, а ад дрэннага выхавання" [8, 206]. Прадстаўнікі беларускай педагагічнай думкі разглядаемага перыяду, знаходзячыяся на розных ідэалагічных плынях, былі адзінадушныя ў тым, што маральнае выхаванне мае выключна важную ролю ў жыцці грамадства. Паступова ў Беларусі даволі ўплывовым становіцца ўяўленне аб усемагутнай сіле выхавання. Так, дапамагаючы людзям уразумець сэнс іх жыццёвага шляху на зямлі, Сімяон Полацкі ўказваў, што чалавечае шчасце схавана ў яго ўласных дабрачыннасцях, якімі кожны павінен пастаянна ўзбагачацца. "Добродетелми богат быти тщися, паче сокровищ теми прославися",– заключаў асветнік [9, 248]. Ён папярэджваў, што набыццё маральных якасцей значна каштоўней любых матэрыяльных скарбаў, нават царскіх.

Вось чаму пры выхаванні дзяцей педагог раіў “прежде обагатить их благонравием и благочестием”.

Такім чынам, хрысціянскімі асветнікамі Беларусі надавалася прыярытэтная роля маральнаму выхаванню ў развіцці асобы і грамадства. Маральная дасканаласць асобы разглядалася і як неабходная ўмова яе духоўнага выратавання, і як грамадзянская каштоўнасць, трывалы падмурак уладкавання дзяржавы.

Літаратура

1. Майхровіч, С.К. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV–XVIII стст. – Мінск : Выш.школа, 1980. – 254 с.

2. О древне-русскихъ училищахъ: разсужденіе, предоставленное въ историко-филологический факультетъ императорскаго Харьковскаго университета, Николаемъ Лавровскимъ, для полученія степени доктора славяно-русской филологии. – Харьковъ : Университетская типографія, 1854. – 186 с.

3. Кніга жыцій і хаджэнняў / Укладанне, прадмова і каментарыі А. Мельнікава. – Мінск : “Мастацкая літаратура”, 1994. – 504 с.

4. Замалеев, А.Ф. Восточнославянские мыслители: эпоха Средневековья / А.Ф. Замалеев. – СПб.: Изд-во СПб. ун-та, 1998. – 270 с.

5. Климент Смолятич. Послание пресвитеру Фоме // Златоструй. – С. 180–190.

6. Памятники литературы Древней Руси: XII век. / Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачёва. – М.: худож. лит., 1980. – 704 с.

7. Скарына, Ф. Творы : прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія / Ф. Скарына; уступ. арт., падрыхт. тэкстаў, камент., слоўнік А.Ф. Коршунава, паказ. А.Ф. Коршунава, В.А. Чамярыцкага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 207 с.

8. Budny S. O urzędzie miecza używającem (1583) / Wyd. S. Kot. Warszawa : Wydr. Kasy im. Nianowskiégo, 1932. – 259 s.

9. Полоцкий, С. Глас последний ко господу Богу // Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии / Избранные произведения XVI – начала XIX в. – Мінск : Изд-во АН БССР, 1962. – 524 с.